*А навакол шумела вясна. Радавалася ўсё жывое. Толькі людзі не маглі радавацца. Людзі ваявалі.*

І. П. Шамякін

**Чарадзейная машына часу**

Уявім сабе, што мы валодаем незвычайнай машынай часу, якая круціцца і можа пераносіць нас у розныя прамежкі жыцця. І тады мы лёгка апынемся ў мінулым ці, наадварот, у будучыні. Але на гэты раз няхай тая чарадзейная машына перанясе нас у 1941 год, пра які мне расказвала мая бабуля Марыя.

…Аднаго летняга дня немцы акружылі нашу вёску, забралі кароў, свіней, авечак. Пасля раздзялілі нас: старых і дзяцей у левы бок, а маладых у правы. Нашу шырэнгу пагрузілі ў машыны і павезлі на захад.

Мы доўга-доўга ехалі. Прыехалі ў нейкі горад, і немец грозна загадаў вылазіць. Мы размясціліся ў будынку. Вячэраць не было чаго, і мы, не еўшы, ляглі спаць.

Раніцай, калі я прачнулася, нам далі загад збірацца на работу. Мне вельмі хацелася есці. Пад’ехалі машыны, мы пагрузіліся і паехалі. Куды – невядома.

Спыніліся мы перад фабрыкай. Мяне паставілі працаваць пры нейкай машыне. Працавалі з васьмі гадзін раніцы да васьмі гадзін вечара. Абедзены перапынак – адна гадзіна. У дванаццаць гадзін дня нам далі абед, які складаўся з кавалачка хлеба і супу.

Жанчын станавілася менш і менш з кожным днём. Людзі паміралі ад голаду і хвароб.

Аднаго разу, у суботу, у нас чамусьці не стала ніводнага немца. Мы пачалі разыходзіцца хто куды. Кожны стараўся знайсці чаго-небудзь паесці.

Колькі было радасці і шчасця, калі мы даведаліся, што вайна закончылася. Не дай Бог нікому, хто жыве на зямлі, перажыць такое жахлівае гора яшчэ раз.

Так закончыла свой расказ мая бабуля.

***Шэпшэлей Іван Уладзіміравіч,***
вучань VI класа ДУА «Олтушская сярэдняя школа»
Маларыцкага раёна